Мішына В.І.
(*Рэспубліка Беларусь, г. Наваполацк*)

СІМВАЛІЧНЫЯ ХАРАКТАРЫСТЫКІ ЛОКУСУ НЯВЕСТЫ Ў ПЕРАДВЯСЕЛЬНЫ ПЕРЫЯД (ПАВОДЛЕ БЕЛАРУСКАЙ ВЯСЕЛЬНАЙ ТРАДЫЦЫІ)

Як вядома, для беларускай вясельнай традыцыі ўласціва досыць працяглая па часе і складаная па структуры перадвясельная частка, падчас якой паміж бакамі жаніха і нявесты дасягаецца і канчаткова замацоўваецца звычаёвымі і абрадава-сімвалічнымі сродкамі згода на шлюб, а таксама адбываецца паэтапнае збліжэнне прадстаўнікоў дзвюх названых абрадавых груп. Сярод абрадаў і звычаяў перадвясельнай часткі адметная роля належыць заручынам (“змовінам”, “вялікім запоінам”), пасля якіх, адпаведна традыцыі, адмовіцца ад шлюбу было ўжо практычна немагчыма, а калі такое здаралася, то гэта негатыўна адбівалася на рэпутацыі жаніха і нявесты [4, с. 43; 3, с. 11].

Такім чынам, заручыны выступалі ў якасці свайго роду памежнай часавай кропкі, пасля якой распачыналася актыўная падрыхтоўка да вяселля. У гаспадарча-пабытовым сэнсе гэта быў час назапашвання неабходных для вясельнага застолля страў і напояў, завяршэння падрыхтоўкі пасагу, вясельных падарункаў і да т.п. У рытуальна-сімвалічным сэнсе заручыны інтэнсіфікавалі працэс абрадавага пераходу, які, паводле наяўных этнаграфічных і фальклорных матэрыялаў, на гэтым этапе найбольш поўна ўвасабляецца ў абрадавым тэксце нявесты. Уласна кажучы, прыкметы ліміналнага стану нявесты назіраюцца на працягу ўсяго перадвясельнага перыяду, пачынаючы ад сватання і запоін, аднак, менавіта ў прамежку паміж заручынамі і вяселлем ён набывае найбольш рэльефны выгляд. Сведчаннем пераходнага стану з’яўляюцца безасабовыя найменні (“нарачоная”, “маладая”), спецыфічныя паводзіны нявесты і адметнасці яе знешняга выгляду, змест прымеркаваных да названага этапу абрадавых песень.

Апрача ўсяго пералічанага, ліміналныя характарыстыкі распаўсюджваюцца і на локус нявесты. Паводле даследаванняў А.К. Байбурына, у перадвясельны перыяд “яе "жыццёвая прастора" рэзка звужаецца і кожны выхад аказваецца значымым. Ад гэтага моманту нявеста можа перамяшчацца толькі з дапамогай і ў суправаджэнні сябровак і, па сутнасці, толькі для таго, каб запрасіць родзічаў на вяселле і развітацца са сваім атачэннем. Яна развітваецца з "белым светам", з домам, сяброўкамі, аднавяскоўцамі нават у тым выпадку, калі яе жаніх з гэтай жа вёскі” [2, с. 66]. Наяўны беларускі матэрыял дазваляе ў пэўнай ступені пацвердзіць гэтыя высновы. Так, паводле запісаў з Віцебска-Пскоўскага памежжа, “пасля першых запоін нявеста, па магчымасці, нікуды не адлучаецца з дому, як бы саромеючыся чужых людзей, што прасватаная”; у многіх лакальных традыцыях зафіксавана абавязковая прысутнасць побач з нявестай у гэты час яе сябровак або старэйшых жанчын, што ва ўсім ёй дапамагаюць [1, с. 155; 4, с. 43–44, 226, 283; 10, с. 376]. М.Я. Нікіфароўскі ў сваіх запісах з Віцебшчыны адзначаў, што “з’яўленне нявесты ў грамадскіх месцах (у царкве, на кірмашы, на вечарынцы і інш.) можа быць небяспечным для яе, таму што тут складана засцерагчыся не толькі ад чарадзейнай псоты, але і ад простага, нязлоснага заглядвання цікаўных, сярод якіх можа знайсціся чалавек з ліхім вокам” [8, с. 56].

Ліміналныя характарыстыкі локусу нявесты досыць выразна адлюстраваны ў цыкле заручынных і перадвясельных песень. У прыватнасці, у іх фігуруе вобраз сада, дзе знаходзіцца маладая ў момант прыезду заручнікаў, пры гэтым яе паводзіны можна ахарактарызаваць як досыць дэструктыўныя: “*Прыехалі заручоначкі, / Каго ж яны заручаць будуць? / Евачкі дома нету, / У садзе вішні шчыплець, / На талерачкі сыплець, / – Гніся, вішанька, гніся, / З каранём вон вярніся / Мне ў мамкі не жыці, / Па саду не хадзіці / Вішань не шчыпаці, / Красачак не рваці, / Вяночка не віці*”; “*Уллянкі дома нету, / Уллянка ў садочку, / З каранём вішню ломіць. / – Гніся, вішня, гніся, / З каранём*

вярніся. / Мне ў таткі не быць, / Вішанек не шчыпаць, / Вяночак не віці / Дзеўкай не слыці” [5, с. 41– 42]. Разбурэнне саду як сімвалічнае знішчэнне старога статусу фігуруе і ва ўзорах кшталту “*Ой, каб я знала, каб я ведала / Што мае заручыны. / Расчыніла б я, растварыла б я / У зелен сад вароцечкі. / А ўвагнала б я, а ўпусціла б я / Стада коней вараненькіх / А няхай коні, хай вараныя / Руту-мяту паламаюць*” [5, с. 110].

Акрамя таго, пасля заручын, што канчаткова замацоўваюць згоду на шлюб і адкрываюць хуткую перспектыву пераезду нявесты на новае месца жыхарства, па-іншаму выглядае і сама хата нявесты: “*Была хата як святліца, / А цяпер – як цямніца, / Была хата, як панская, / А цяпер – як цыганская*” [5, с. 91].

Паводле сведчання даследчыка рускай вясельнай традыцыі Н.У. Зорына, засватаная нявеста “поўнасцю адмяжоўвалася ад усіх хатніх клопатаў сям’і, становячыся "госцяй у сваім доме". <…> Адзінымі яе заняткамі ў гэты перыяд былі прывядзенне ў парадак свайго пасагу і падрыхтоўка падарункаў для жаніха, яго родзічаў і паязжан. У гэтым ёй дапамагалі дзяўчаты з радні і сяброўкі-аднагодкі” [6, с. 65], што, зноў-такі ўказвае на лімінальны статус нявесты. З гэтымі звесткамі карэлююць і беларускія матэрыялы: “…у перадвясельны час нявеста звычайна шые бялізну для жаніха. Ёй дапамагаюць дружкі, г.зн. сяброўкі”; “увесь гэты тыдзень маладая рыхтуецца: дбае аб вянку, назапашвае каснікі, г.зн. стужкі, таму што надта шмат іх трэба, да ручнікоў прышывае трэпкі, або махры, вязаныя яшчэ ў дзяцінстве..., шые для нарачонага шлюбны вянок і два гарнітуры ўбрання, якія складаюцца з простай, з грубага палатна кашулі і такой жа пары сподняга”; “нявеста і яе паднявесніцы шыюць жаніху бялізну, "вянчальнае плацце" нявесце, вышываюць рушнікі, нарыхтоўваюць падарункі і г.д.” [4, с. 283, 329, 454]. Беларускія этнаграфічныя матэрыялы непасрэдных указанняў на вызваленне нявесты ад прац па гаспадарцы, відавочна, не ўтрымліваюць, але лагічна было б меркаваць, зыходзячы з вышэйпрыведзеных прыкладаў, што ўвесь свой час нявеста сапраўды прысвячала падрыхтоўцы да вяселля. Ускосным пацверджаннем таму могуць служыць сюжэты некаторых заручынных песень, дзе ўказваецца, што пасля таго, як бацькі “прапілі дачку”, “некаму кароў даіць”, “некаму месці хаткі”, “некаму цепліць печы”, “некаму памыць ложкі”, што, на нашу думку, таксама можа ўказваць на абмежаванне гаспадарчых заняткаў нявесты ў перадвясельны час [5, с. 101]. На адмысловы статус нявесты ў роднай хаце пасля заручын указваюць і тэксты, у якіх яна адмаўляецца падаць бацькам вады: *“– Да заручоная дзеванька, / Да падай бацюхну вадзіцы ... / – Ужо я табе, бацюхна, не слуга, / Ужо мая вадзіца дарага, / Да даражэй мёду і віна – / Пяць залатых ад вядра”; “А ў цябе дзетачкі меншыя, / Яны табе служачкі лепшыя: / Яны табе вадзіцы пададуць, / Яны цябе татачкам назавуць*” [5, с. 118–119].

Адметным чынам лімінальныя характарыстыкі локусу нявесты ўвасабляюцца ва ўсходнепадзвінскай лакальнай традыцыі і сумежных рэгіёнах. Уласцівыя ім вясельныя галашэнні можна разглядаць у якасці своеасаблівага інструмента, з дапамогай якога адбываецца не толькі акцэнтуацыя пераходнага стану нявесты, але і ў пэўнай ступені рэалізуецца сам механізм абрадавага аддзялення: “У дзень вянчання, раніцой, нявеста абыходзіць усе пабудовы свайго бацькі, палі, лугі, кусты, развітваецца з імі, галосячы і прычытваючы на кожным месцы, прыпамінаючы, што там яна з сяброўкамі весела праводзіла час” (Гарадоцкі павет) [9, с. 394]. У галашэннях, зафіксаваных на Себежшчыне яшчэ ў сярэдзіне XIX ст., што прымеркаваны да падобнага абыходу, матывы аддзялення гучаць надзвычай яскрава: “*Насвет маи улушки широкиі! / Я любила тут хадзиць, красаватца, / Часаць сваю буйную галованьку, / Заплятаць русую косаньку, / Складаць на галаву залатой вянок*” [1, с. 157]. Пры гэтым у цытаваным узоры выразна бачна падвойнасць лімінальнага статусу нявесты, якая развітваецца як з месцам свайго жыхарства, так і з дзявоцкім статусам. Падобныя абыходы з галашэннямі – фактычна апошняе рэгламентаванае традыцыяй перамяшчэнне нявесты ў межах свайго локусу (у шырокім сэнсе як “жыццёвай прасторы”) у дашлюбным

статусе. Варта адзначыць, што ў лакальных традыцыях Себежшчыны і Невельшчыны драматычнае развітанне нявесты са сваім локусам аказалася досыць устойлівым элементам, што пацвярджаецца экспедыцыйнымі запісамі, зробленымі расійскімі даследчыкамі на Пскоўшчыне ў другой палове XX ст: “Вечарам, напярэдадні вяселля, баяркі вадзілі нявесту па вёсцы "галасіць". "Все избы па дяревни абайдуть, в каждый дом зайдуть, невесту водють"; "Завтра – свадьба, в вечере водят невесту па дяревни. Вадили, невеста уклонивалась всим и плакали, песни играли""; “За тыдзень да вяселля нявеста з сяброўкамі "хадзіла па таках": абыходзіла ўсе пабудовы – такі, "пуні"…, "осеці"…, развітвалася "с усим будынкам са сваим". Сяброўкі і нявеста … "галасили, выли хадя»: «Ай, таки мае, таки, таки новыи! / Ай, цапы мае, цыпы, цапы лоўкии! / Мне па етых таках ни пахаживыть, / Да мне з этым цепам ни малачивать"” [7, с. 395, 555].

Такім чынам, локус нявесты ў перыяд паміж заручынамі і вяселлем набывае выразныя лімінальныя рысы, паколькі зведвае пэўныя трансфармацыі: фактычна звужаецца да межаў хаты і двара (за выключэннем рэгламентаваных развітальных абыходаў); зведвае на сабе пэўныя трансфармацыі або дэструктыўныя ўздзеянні (матыў знішчэння саду як дзявочай прасторы, змены знешняга выгляду хаты ў абрадавым фальклоры) і да т.п. Лімінальныя характарыстыкі локусу нявесты знаходзяцца ў цеснай узаемасувязі з лімінальным станам самой нявесты.

Літаратура

1. Анимелле, Н. Быт белорусских крестьян / Н. Анимелле // Этнографический сборник, издаваемый Императорским Русским географическим обществом. – Вып. 2. – СПб, 1854. – С. 111–268.
2. Байбурин, А. К. Ритуал в традиционной культуре: Структурно-семантический анализ восточнославянских обрядов / А. К. Байбурин. – СПб.: Наука, 1993. – 240 с.
3. Беларускае вяселле: Абрад. Зычэнні. Тосты. Прыказкі. Фразеалагізмы: на матэрыяле Гродзеншчыны / М. А. Даніловіч, Н. К. Памецька, І. В. Піваварчык. – Гродна, 2000. – 131 с.
4. Вяселле: Абрад./ уклад., уступ. арт. і камент. К. А. Цвіркі; рэд. тома В. К. Бандарчык, А. С. Фядосік. – 2-е выд. – Мінск: Бел. навука, 2004. – 683 с.
5. Вяселле: Песні. У 6 кн. / рэд. М. Я. Грынблат, А. С. Фядосік – Мінск: Навука і тэхніка, 1980–1988. – Кн. 1 / склад. Л. А. Малаш. – 1980. – 680 с.
6. Зорин, Н. В. Русский свадебный ритуал / Н. В. Зорин. – М.: Наука, 2004. – 248 с.
7. Народная традиционная культура Псковской области: Обзор экспедиционных материалов из научных фондов Фольклорно-этнографического центра. – В 2 т. – Псков: Издательство Областного центра народного творчества, 2002. – т. 2. – 816 с.
8. Никифоровский, Н. Я. Простонародные приметы и поверья, суеверные обряды и обычаи, легендарные сказания о лицах и местах. Собраны в Витебской губернии / Н. Я. Никифоровский. – Витебск, 1897. – 336 с.
9. Романов, Е. Р. Белорусский сборник. – Вып. 1–9 / Е. Р. Романов. – 1886–1912. – Вып. 8.: Быт белоруссa. – Вильна, 1912. – 600 с.
10. Шейн, П. В. Материалы для изучения быта и языка русского населения Северо-Западного края / П. В. Шейн. – СПб., 1887–1902. – Т. 1. – Ч. 2.: Бытовая и семейная жизнь белоруссa в обрядах и песнях. – 1890. – 708 с.